ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1985

18

КРАСАВІКА

ЧАЦВЕР

№ 14 (1464)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ТЭЛЕТАЙП

«СЁННЯ - ЗАЎТРА»

БЮРО ПАРТКОМА

абмеркавала пытанні аб ходзе падрыхтоўкі да святкавання 40-годдзя Вялікай Перамогі на філалагічным факультэце і аб рабоце савета па атэістычнаму выхаванню.

Заслуханы справаздачы прарэктара па вучэбнай рабоце У. С. Багданава і рэдактара газеты «Беларускі універсітэт» В. П. Вараб'ёва.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

У ФОНД МІРУ

і XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў пералічыла ленінскую стыпендыю выдатніца вучобы, студэнтка філалагічнага факультэта Вікторыя Каўхута.

А. ПАДАЛКА.

«МЕРЫДЫЯНАМІ ДРУЖБЫ»

— пад такім дэвізам прайшоў нядаўна на паліграфічным камбінаце імя Я. Коласа інтэрнацыянальны вечар, які падрыхтавалі студэнты факультэта журналістыкі сумесна з моладдзю камбіната. На вечары прысутнічалі студэнты з многіх краін свету. Цікава расказвалі пра сваю радзіму прадстаўнікі Кубы, ЧССР, Лівана. Захапілі гледачоў вясёлыя кубінскія танцы, савецкія песні і вершы аб міры.

На вечары ўдзельнікі прынялі зварот да моладзі г. Мінска, асноўны сэнс якога — заклік змагацца за мір на планеце, дастойна сустрэць XII Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў.

І. КАЖЭЎНІКАВА, студэнтка факультэта журналістыкі.

ДА 90-ГОДДЗЯ С. ЯСЕНІНА

на геаграфічным факультэце адбыўся арганізаваны сумесна з бібліятэкай літаратурна-музычны вечар, прысвечаны яго творчасці. На вечары выступіла загадчыца аддзела масавай работы бібліятэкі Р. І. Ляховіч, якая расказала аб жыцці і творчасці паэта. На канцэрце студэнты прачыталі вершы Ясеніна, выканалі песні, напісаныя на словы паэта, выступілі ўдзельнікі універсітэцкага хору, а таксама прагучалі вершы пра Ясеніна, напісаныя студэнтамі геафака.

Дацэнт фізфака Г. В. Шышкін у сваім выступленні падкрэсліў антываенны матыў у творчасці паэта.

І. КРЫВІЦКАЯ.

ТВАЯ ДРУГАЯ ПРАФЕСІЯ

ПРАМОЎЦАМІ НЕ НАРАДЖАЮЦЦА...

— ЦІ МОЖНА НАВУЧЫЦЦА лектарскаму майстэрству? — спыталі мы ў кіраўніка школы маладога лектара факультэта грамадскіх прафесій, кандыдата філасофскіх навук, выкладчыка кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў Аляксандра Аляксеевіча ГРЫЦАНАВА.

— Вядома, можна. Для гэтага неабходны толькі дзве ўмовы: жаданне вучыцца і пастаянная практыка. Апошняе можна забяспечыць.

ДАВЕДКА. Зараз у радах Усесаюзнага таварыства «Веды» — 3200 тысяч чалавек, у тым ліку 2 тысячы акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі навук СССР, галіновых акадэмій, акадэмій навук саюзных рэспублік, каля 200 тысяч дактароў і кандыдатаў навук, прафесараў і дацэнтаў, больш за 1 мільён настаўнікаў. Члены таварыства «Веды» у год па краіне чытаюць каля 30 мільёнаў лекцый.

— Якім павінен быць сучасны малады лектар?

— Па-мойму, галоўнае — гэта павага і любоў да людзей, высокая патрабавальнасць да самога сябе, прафесіяналізм і перакананасць.

Неабходна пастаянная работа над сабой, падтрыманне высокага ўзроўню псіхалагічнай і нават фізічнай падрыхтоўкі, таму што лектар часам чытае лекцыі па некалькі гадзін.

У наш час павышанай інфарматыўнасці лектар часцей выступае як каментатар, чым як інфарматар, гэта непазбежна. Але нягледзячы на вялікую колькасць сучасных сродкаў масавай інфармацыі цікавасць да лекцыйнай прапаганды расце. Гэта тлумачыцца цягай людзей да жывых зносін, магчымасцю атрымання канкрэтнага адказу на нечаканае студэнтаў ведамі і навыкамі прапагандысцкай і агітацыйна-масавай работы. Маладыя спецыялісты, тым больш спецыялісты з універсітэцкім дыпломам, павінен умець правільна і даступна растлумачыць праблемы тэорыі марксізму-ленінізму, актуальныя пытанні грамадскага жыцця краіны.

ДАВЕДКА. Школа маладога лектара працуе з 1964 года на правах лектарска-прапагандысцкага аддзялення. Першая група аддзялення лектарскага майстэрства была створана на базе гістарычнага і юрыдычнага факультэтаў. Зараз найбольш актыўнымі ўдзельнікамі школы маладога лектара з'яўляюцца студэнты гістарычнага і механіка-матэматычнага факультэтаў. На жаль, мала студэнтаў з філфака і журфака. А ім, будучым настаўнікам і работнікам ідэалагічнага фронту, у першую чаргу неабходна ведаць асновы лектарскага майстэрства.

— Кім могуць працаваць выпускнікі школы маладога лектара?

— Атрымаўшы пасведчанне аб заканчэнні ШМЛ, выпускнікі могуць працаваць лектарамі на трох узроўнях: першы — выступленне з лекцыямі перад насельніцтвам і студэнтамі ў час зорных паходаў, перад байцамі студэнцкіх будаўнічых атрадаў; другі — работа пазаштатнымі лектарамі лектарскіх груп райкомаў і абкомаў ВЛКСМ; трэці — найбольш высокі ўзровень — работа лектарамі таварыства «Веды». З гэтай мэтай савет школы маладога лектара, які аб'ядноўвае выкладчыкаў кафедраў грамадскіх навук, прадстаўнікоў парткома, камітэта камсамола, праўлення таварыства «Веды», дэканата ФГП, праводзіць атэстацыю найбольш здольных студэнтаў, дзе яны павінны прачытаць асноўныя тэзісы выбраных імі тэм.

ДАВЕДКА. Толькі ў мінулым годзе савет школы маладога лектара рэкамендаваў у члены таварыства «Веды» 85 лектараў.

— У якой форме праходзяць заняткі ў школе маладога лектара?

— Школа зараз у пошуку. Нядаўна я вярнуўся з Масквы, дзе вывучаў работу ШМЛ іншых ВНУ краіны, і зараз упэўнены, што ў нашай рабоце неабходны некаторыя змены. Напрыклад, у нас ужо ўсталявалася, што нярэдка ў школу прыходзяць першакурснікі. Але гэтыя студэнты, як правіла, не маюць дастатковага ўзроўню падрыхтоўкі. Думаецца, дэканату ФГП і камітэту камсамола універсітэта ёсць над чым задумацца. Патрэбна накіроўваць у школу маладога лектара студэнтаў другіх і трэціх курсаў.

У рабоце мы выкарыстоўваем такія формы, як чытанне лекцый і заняткі па секцыях.

У працэсе работы агульны паток студэнтаў дзеліцца па інтарэсах. У школе маладога лектара арганізуюцца філасофская, эканамічная, псіхалагічная, педагагічная, атэістычная, этычная секцыі, а таксама секцыі па пытаннях знешняй і ўнутранай палітыкі СССР і міжнароднага маладзёжнага руху. Заняткі ў секцыях праходзяць у форме семінараў.

— Васемнаццатага красавіка мы адзначаем Дзень маладога лектара. Як будзе праходзіць у нас гэтае свята?

— У гэты дзень мы праводзім традыцыйную канферэнцыю маладых лектараў, на якой слухачы школы выступаюць з дакладамі. Гэта адначасова і практыка, і падвядзенне некаторых вынікаў.

— Лекцыя закончылася, але студэнты не разыходзяцца. Яны даюць ацэнку лекцыі...

— Так, кожная лекцыя атрымлівае ацэнку, якую даюць слухачы. І прыемна адзначыць: пакуль усе лекцыі атэставаны вышэйшым балам.

Гутарку вяла С. МАХОЦІНА, студэнтка філалагічнага факультэта.

ПАСЛЬНЫ ўклад у вырашэнне агульнадзяржаўнай праграмы стварэння, развіцця і эфектыўнага выкарыстання вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм уносіць кафедра тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі.

НА ЗДЫМКУ: супрацоўнікі навукова-даследчага сектара дэманструюць загадчыку кафедры прафесару Г. А. Мядзведзеву распрацаваныя праграмныя вырабы.

Фота П. НАВАТАРАВА.

Юнакі і дзяўчаты! Нястомна авалодвайце ведамі, культурай, прафесіянальным майстэрствам! Прымнажайце рэвалюцыйныя, баявыя і працоўныя традыцыі Камуністычнай партыі і савецкага народа!

Вучыцеся па-ленінску жыць, працаваць, змагацца!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

САЛЮТ, ФЕСТЫВАЛЬ!

ДРУЖБАЮ МОЦНЫЯ

ПАКОЙ ДРУЖБЫ ў інтэрнаце № 2 стаў штабам фестывальнага клуба «Планета», які пачаў сваю работу яшчэ ў снежні мінулага года. Тут збіраюцца студэнты з розных краін свету, тут мацнее дружба паміж імі, а значыць і паміж іх краінамі. У пакоі сабраны матэрыял па фестывальнаму руху. Інтэрсектар камітэта камсамола факультэта журналістыкі праводзіць тут сустрэчы з замежнымі студэнтамі.

Вельмі цікава прайшла сустрэча са студэнтамі з Палесціны. Сама абстаноўка спрыяла даверлівай размове. Моцны, духмяны чай, наўрад ці піў хто такі раней, заварыў палесцінскі студэнт Назіх. Савецкія дзяўчаты прынеслі пячэнне і цукеркі. Сабраліся розныя людзі як па сваіх будучых прафесіях, так і па нацыянальнасці. Студэнты з Савецкага Саюза — будучыя фізікі, студэнты з Палесціны — будучыя журналісты і юрысты. Усіх прывяло сюды пачуццё інтэрнацыяналізму, дружбы, салідарнасці.

Старшыня палесцінскага земляцтва студэнтаў Аль Хаціб Набіль расказваў аб становішчы свайго народа, аб барацьбе, якую вядуць палесцінцы вось ужо колькі гадоў за сваю незалежнасць. Не паспеў ён сказаць апошняе слова, як пасыпаліся пытанні. Без дапамогі землякоў Набілю не справіцца б. У размову ўступілі Хасан Рабаі, Аль Шарых Фахід, Аль Аграмэ Мустафа...

Размова працягвалася. Непрыкметна яна перайшла на тэму XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве. Тут ролі памяняліся. У гэтым пытанні больш кампетэнтнымі былі савецкія студэнты. Яны расказвалі сваім палесцінскім сябрам аб фестывальным руху, аб тым, як Масква рыхтуецца сустрэць гасцей з усяго свету. Пагаварылі яны і аб задачах, якія стаяць непасрэдна перад студэнтамі мінскіх ВНУ у падрыхтоўцы да фестывалю.

Безумоўна, усе засталіся задаволеныя сустрэчай. Думаецца, у карысці яе ніхто не будзе сумнявацца.

Н. МАРЦІНКЕВІЧ, член інтэрактыву факультэта журналістыкі.

Слаўныя ветэраны, настаўнікі моладзі! Перадавайце маладому пакаленню свае веды, багаты жыццёвы вопыт! Выхоўвайце юнакоў і дзяўчат палымянымі патрыётамі нашай Радзімы, самаадданымі барацьбітамі за справу Леніна, за камунізм!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

АБ ГЕРОЯХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ І ГЕРОЯХ САВЕЦКАГА САЮЗА, ЯКІЯ ЖЫВУЦЬ У МАСКОЎСКІМ РАЁНЕ ГОРАДА, РАСКАЗВАЮЦЬ МАТЭРЫЯЛЫ 2-й — 3-й СТАРОНАК НАШАЙ ГАЗЕТЫ.

ГВАРДЗЕЙСКАЯ ЗАГАРТОЎКА

«ПРАШУ ЗАЛІЧЫЦЬ ДОБРААХВОТНІКАМ...»

ТАК ПАЧЫНАЛАСЯ заява 17-гадовага слесара Мікалая Шарко ў адзін з райваенкаматаў горада Куйбышава. Сэрца юнака гарэла жаданнем помсты за сваю разбітую мару, за матчыны слёзы, за родную беларускую зямлю, што апынулася пад чорным фашысцкім ботам...

Нарадзіўся ён у вёсцы Макаўчыцы Дзяржынскага раёна ў сялянскай сям'і. Калі пасля заканчэння школы паступіў у Ленінградскае фабрычна-заводскае вучылішча, радасці маці Надзеі Аляксандраўны не было канца. «Будзе Міколка пры надзейнай справе,— цешылася яна ў думках,— стане трывала на ногі, сям'і дапаможа».

І вось, здаецца, матчына жаданне пачало здзяйсняцца. Сын вучыўся добра, атрымаў пяты разрад слесара і быў накіраван на адказныя будоўлі Паволжа. Рукі хлопца прагнулі сур'ёзнай работы. Ды чым іншым мог ён аддзякаваць Радзіме за яе бязмерныя клопаты? Аднак на шляху да мэты паўстала вайна. І тады нарадзілася гэта заява.

Мабыць, ніяк нельга было адмовіць яго гарачаму юнацкаму абурэнню, выкліканаму бандыцкім нападам гітлераўскіх полчышчаў на сацыялістычную Айчыну. Але ж і на фронт яму было ранавата. Мікалая Шарко накіравалі вучыцца ў ваеннае пяхотнае вучылішча.

— Кожны дзень вучобы здаваўся нам месяцам,— успамінае Мікалай Піліпавіч.— Усёй душой мы рваліся на гераічныя рубяжы, дзе грымелі жорсткія смяротныя баі, дзе вырашаўся лёс Краіны Саветаў. Цяжка словамі перадаць наш уздым, калі мы, курсанты, даведаліся аб выніках сакрушальнай Сталінградскай эпапеі. Здавалася тады, што і павяваць па-сапраўднаму ўжо не давядзецца, што ўсё галоўнае зробяць без нас...

Не, шмат яшчэ дымнага салдацкага хлеба трэба было з'есці, многімі ваеннымі дарогамі прайсці лейтэнанту Шарко і яго равеснікам. У сакавіку 1943 года трапіў ён, 19-гадовы афіцэр, у славутую 8-ю гвардзейскую армію, якой камандаваў герой Сталінградскай бітвы Васіль Іванавіч Чуйкоў. І цяпер лічыць Мікалай Піліпавіч, што яму моцна пашанцавала. Нават простае ўсведамленне сваёй прыналежнасці да гераічнай кагорты гвардзейцаў падвойвала і патройвала сілы воінаў.

З гэтым злучэннем звязан увесь франтавы лёс Мікалая Шарко. У яго саставе прайшоў з баямі па дарогах Украіны і Польшчы, фарсіраваў Паўночны Данец, Інгул, Паўднёвы Буг і Віслу, вызваляў шматлікія гарады і вёскі, з узводнага вырас да камандзіра роты. І самае незабыўнае — быў удастоен высокага звання Героя Савецкага Саюза. Гэты шлях — ланцуг з дзесяткаў баявых эпізодаў.

НАТХНЯЎ ПРЫКЛАД КАМАНДЗІРА

— Аднойчы летам 1943 года,— гаворыць ветэран,— выклікаў мяне камандзір батальёна і паведаміў, што майму ўзводу даручана адказнае заданне: захапіць і даставіць у штаб «языка». Зрабіць гэта нялёгка, папярэдзіў камбат, бо немцы пільна сочаць за нашым пярэднім краем, апаясаўшы свае пазіцыі міннымі палямі. Аднак заданне павінна быць выканана абавязкова і як мага хутчэй. Давер'е камандавання наш узвод апраўдаў.

У першай вылазцы за «языком» удзельнічаў сам лейтэнант Шарко. Дастаўлены ў штаб нямецкі фельдфебель паведаміў вельмі важныя звесткі: варожы бок канцэнтруе на гэтым участку фронта вялікія сілы для нечаканага ўдару па нашых пазіцыях. Трэба было яшчэ раз праверыць гэта паведамленне, глыбей пранікнуць у тыл ворага, правесці дакладную разведку.

— Групай байцоў камандаваў сяржант Калашнікаў,— працягвае Мікалай Піліпавіч.— Разведчыкам удалося непрыкметна прайсці праз варожыя пазіцыі, зрабіць праход у мінным полі. Далей ад пярэдняга краю яны заўважылі сканцэнтраванне танкаў і гармат праціўніка, матарызаваных часцей. Даныя занеслі на карту і пачалі адыходзіць. І тут ззаду пачуўся злосны брэх аўчаркі. Немцы выявілі праход у мінным полі, зроблены нашымі байцамі, і пусцілі па іх слядах сабаку.

Становішча рабілася крытычным. Хутка ацаніўшы абстаноўку, сяржант загадаў байцам непрыкметна рухацца ў абход, а сам застаўся прыкрываць іх. Падпусціўшы фашыстаў на блізкую адлегласць, Калашнікаў адкрыў прыцэльны агонь. Немцы залеглі. Трапнымі выстраламі сяржант знішчыў аўчарку. Калі гітлераўцы здагадаліся, што супраць іх абараняецца адзін баец, яны вырашылі ўзяць яго жывым. Гэта зразумеў і Калашнікаў.

Расстраляўшы ўсе патроны, ён пусціў у ход гранаты. Мужны разведчык загінуў, аднак яго таварышы даставілі ў штаб надзвычай важную інфармацыю. Нашы самалёты нанеслі магутны бомбавы ўдар па тылавых сканцэнтраваннях ворага. Цаной свайго жыцця сяржант Калашнікаў забяспечыў поспех наступальных дзеянняў дывізіі, збярог ад гібелі сотні сваіх аднапалчан. Гітлераўскія ваякі не былі здольнымі на такія ўчынкі па самой сваёй прыродзе і псіхалогіі...

Мікалай Піліпавіч мала гаворыць аб сабе. А між тым за праяўленую адвагу у баях на тэрыторыі Украіны ён быў узнагароджан двума ордэнамі Айчыннай вайны і ордэнам Чырвонай Зоркі. Рота, якой ён камандаваў, асабліва вызначылася пры фарсіраванні Днястра і Паўднёвага Буга, дзе ёй даручалася захапіць на супрацьлеглым беразе плацдарм і ўтрымліваць яго да падыходу асноўных сіл. Заданні камандавання байцы на чале з Шарко выконваліся з гонарам. Не аднойчы мужны камандзір вадзіў іх у штыкавыя атакі, паказваючы прыклад асабістай мужнасці.

НА ВІСЛЕНСКІМ ПЛАЦДАРМЕ

У сярэдзіне студзеня 1945 года, пасля магутнай артылерыйскай падрыхтоўкі, войскі 1-га Беларускага фронта з пазіцый на поўдзень ад Варшавы перайшлі ў рашучае наступленне. У першых радах атакуючых знаходзілася рота гвардыі капітана Шарко. Вораг аказваў упартае супраціўленне. Аднак, умела выкарыстоўваючы абходныя манеўры, удары з тылу і флангаў, Мікалай Піліпавіч вёў роту наперад.

— Баі ішлі цяжкія,— дзеліцца думкамі Мікалай Піліпавіч.— Напрыклад, у горадзе Антанінск даводзілася штурмам браць кожны дом, весці рукапашныя схваткі на кожным кроку. Тут акапаліся эсэсаўцы, якія гатовы былі б знішчыць уласны народ, каб толькі прадоўжыць сваё існаванне. Той памятны бой праходзіў 26 студзеня 1945 года. А запомніўся ён асабліва таму, што я асабіста знішчыў нямецкага генерала і некалькі афіцэраў.

Пасля вызвалення горада Лодзі 244-му гвардзейскаму стралковаму палку было загадана наступаць на Познанскую цытадэль і авалодаць ёю. У галаве калоны рухалася на танках рота Шарко. Моцным арэшкам была цытадэль. Подступы да яе ахоўвалі 18 фортаў і 54 доты, якія, як і саму цытадэль, апаясваў супрацьтанкавы роў шырынёй да васьмі і глыбінёй да чатырох метраў.

Больш трох тыдняў ішлі тут жорсткія баі. Познань была акружана часцямі 29-га гвардзейскага механізаванага корпуса, якім камандаваў генерал-лейтэнант Аляксандр Дзмітрыевіч Шамянкоў, ураджэнец Беларусі. Пазней ён напісаў кнігу ўспамінаў «Штурм цытадэлі», у якой шмат цёплых радкоў прысвяціў капітану Шарко, адзначыўшы яго асабістую мужнасць і храбрасць, умелае кіраўніцтва падраздзяленнем. У адным з баёў Мікалай Піліпавіч быў паранены, аднак застаўся ў страі. Больш таго, у крытычны момант сам лёг за кулямёт. Побач разарваўся варожы снарад, і афіцэр страціў прытомнасць...

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 24 сакавіка 1945 года гвардыі капітану М. П. Шарко было прысвоена званне **Героя Савецкага Саюза**. Высокую ўзнагароду яму ўручыў у Крамлі Міхаіл Іванавіч Калінін.

ВЕРНАСЦЬ СЦЯГУ БАЯВОМУ

Пасля доўгага лячэння ў шпіталі Мікалай Піліпавіч вярнуўся ў родныя мясціны. І на мірным фронце дэманструе ён гвардзейскую загартоўку. Закончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ і педагагічны інстытут імя Горкага. Звыш 35 гадоў працуе ў органах сацыяльнага забеспячэння рэспублікі. Узнагароджан двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэнам «Знак Пашаны», дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Вядзе актыўную работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі, за што ўдастоен многіх ганаровых адзнак.

Выраслі ў Мікалая Піліпавіча двое дзяцей, падрастаюць трое ўнукаў. І, вядома, яго галоўнае жаданне, каб заўжды над імі было мірнае неба Радзімы, за свабоду і незалежнасць якой ён, воін-вызваліцель, воін-інтэрнацыяналіст, мужна змагаўся з ворагам.

У. КУНДАЛЕВІЧ.

ІМЯ ЗІНАІДЫ Дзмітрыеўны Гарачка добра вядома ў Мінскім вытворчым абутковым аб'яднанні «Прамень». У 1948 годзе яна скончыла рамеснае вучылішча і засталася рыхтаваць маладое папаўненне абутнікоў. Аднак яе цягнула паспрабаваць свае сілы на вытворчасці, і ў 1950 годзе Зінаіда прыходзіць на фабрыку. Валодаючы арганізатарскімі здольнасцямі, вялікімі ведамі і жаданнем працаваць не пакладаючы рук, яна хутка становіцца ў рады правафланговых сацыялістычнага спаборніцтва. За кароткі час асвоіла ўсе тэхналагічныя аперацыі швейнага ўчастка па пашыву жаночага мадэльнага абутку. У 1952 годзе як ініцыятыўная і валодаючая дзелавымі і арганізатарскімі якасцямі работніца была назначана майстрам швейнага ўчастка. За высокія паказчыкі ў спаборніцтве брыгадзе, якую ўзначальвала З. Д. Гарачка, у 1960 годзе было прысвоена званне «Брыгада камуністычнай працы». За высокія вытворчыя паказчыкі, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, датэрміновае выкананне сямігадовага плана Зінаідзе Дзмітрыеўне Гарачка прысвоена званне **Героя Сацыялістычнай Працы.**

Зараз З. Д. Гарачка працуе майстрам вытворчага навучання ў ГПТВ-43. Свой багаты вытворчы і жыццёвы вопыт яна перадае маладому пакаленню абутнікоў. І тут яе вызначае творчы падыход да справы, наватарства ў правядзенні заняткаў.

А. САЗАНОВІЧ.

НА ЗДЫМКУ: майстар вытворчага навучання З. Д. Гарачка знаёміцца з творчасцю навучэнцаў.

Фота Б. БУСЛАВА.

Калі вам раптам давядзецца сустрэцца з Таццянай Васільеўнай Бірыч і яна загляне ў вашы вочы так, нібы наскрозь хоча разгледзець іх, не здзіўляйцеся: за паўстагоддзя работы ў вочнай клініцы ў яе даўно выпрацавалася такая прафесійная звычка.

ПРАФЕСАР Камінскі адразу звярнуў увагу на гэтую працавітую студэнтку, цікаўную ўдзельніцу навуковага гуртка. І ў дваццаць восьмым, адразу, як атрымала дыплом, ён прапанаваў Таццяне Бірыч працаваць у яго клініцы.

Потым аспірантура ў Маскве — у клініцы прафесара Адзінцова. Ужо там спецыялісты адзначалі глыбіню навуковых даследаванняў, якія праводзіла аспірантка Бірыч. У Мінск яна вярнулася сталым афтальмолагам. Хутка была выбрана асістэнтам, а пасля абароны кандыдацкай дысертацыі — дацэнтам кафедры вочных хвароб Мінскага медыцынскага інстытута. Задаволены быў ёю і прафесар Філатаў, калі яна цэлы год удасканальвалася ў яго клініцы ў Адэсе. А галоўнае — радаваліся хворыя: Таццяна Васільеўна Бірыч бралася за самыя складаныя аперацыі і рабіла іх усё больш паспяхова.

Набытыя веды і вопыт асабліва спатрэбіліся ў час вайны, калі яна працавала ў клініцы вочных хвароб Саратаўскага медінстытута і ў эвакашпіталі. Колькі раненых яна выратавала, вярнула ім зрок! І працягвала вучыць будучых афтальмолагаў — узначаліла там кафедру вочных хвароб. Не спыняла і навуковых даследаванняў, эксперыментаў. У Саратаве пачала прымяняць аксігенатэрапію, або кісларод пры лячэнні апёкаў і іншых вочных захворванняў.

Над гэтай праблемай многія гады працавала і вярнуўшыся ў Мінск, узначальваючы тут кафедру і клініку вочных хвароб. Пасля абароны доктарскай дысертацыі на гэту тэму, стаўшы прафесарам, Таццяна Васільеўна многія гады распрацоўвала і ўдасканальвала гэты новы метад лячэння.

У 1962 годзе прафесар Бірыч упершыню далажыла на Усесаюзнай канферэнцыі афтальмолагаў у Адэсе аб выніках выкарыстання нізкіх тэмператур пры выдаленні катаракт. Зараз гэту аперацыю называюць жамчужынай вочнай хірургіі.

15 гадоў узначальвала Т. В. Бірыч партыйную арганізацыю 3-й клінічнай бальніцы. Многія гады была членам райкома і гаркома партыі, дэпутатам Мінскага гарсавета і Вярхоўнага Савета БССР. Ужо трыццаць гадоў яна ўзначальвае рэспубліканскае таварыства афтальмолагаў. У Акадэміі навук БССР уваходзіць у састаў камісіі па Дзяржаўных прэміях. Член Таварыства савецка-чэхаславацкай дружбы. За выдатныя заслугі ў развіцці медыцынскай навукі і аховы здароўя заслужанаму дзеячу навук БССР, заслужанаму ўрачу рэспублікі, галоўнаму афтальмолагу Беларусі, члену-карэспандэнту Акадэміі навук БССР, прафесару Таццяне Васільеўне Бірыч прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Гафар Назаравіч Насардзінаў, запаўняючы асабісты план прапагандыста, задумаўся, калі прачытаў графу «стаж работы прапагандыста». Калі б задалі яму такое пытанне, ён, не задумваючыся, адказаў бы: «Усё жыццё». Магчыма, гэта некаму здасца перабольшаннем. Але толькі не таму, хто ведае Гафара Назаравіча.

Стаць прапагандыстам яго заклікалі жыццё, трывожны час. Вайна ўварвалася ў яго жыццё рана. Гафару Насардзінаву даверылі камандаваць людзьмі. А камандзір — у першую чаргу прапагандыст. У далёкім 1944 годзе ўручылі Г. Насардзінаву бясцэнную чырвоную кніжачку — партыйны білет. З гэтага часу яго жыццё пастаянна звязана з людзьмі вось ужо сорак гадоў, зносіны з імі робяць жыццё багацейшым, больш насычаным, цікавым.

ВЫХОЎВАЦЬ ПРЫКЛАДАМ

Шэсць гадоў назад Г. Н. Насардзінаў узначаліў работу аддзела грамадзянскай абароны на Мінскім вытворчым абутковым аб'яднанні «Прамень». І вось ужо шэсць гадоў ён прыходзіць у аўдыторыі да слухачоў, якія чакаюць яго: з Гафарам Назаравічам размаўляць цікава. Да гэтага ў Насардзінава таксама работа была падобная, толькі аўдыторыя крыху іншая — салдацкая. Але чаму ж іншая... Задача і там і тут перад ім — складаная, а таму і цікавая — выхоўваць моладзь.

Год назад Г. Н. Насардзінаву даверылі весці заняткі ў школе маладых камуністаў. Яго слухачы — гэта, у асноўным, маладыя рабочыя, якім праз год уручаць партыйныя білеты. Вось чаму весці заняткі ў гэтай школе не толькі ганарова, працаваць з кандыдатамі ў члены партыі — вялікая адказнасць. Які багаж маральных і духоўных ведаў назапасяць за два гады навучання дваццаць чатыры слухачы, якія ўрокі вынесуць — прапагандыст у адказе. Вядома, слухачы школы маладых камуністаў — лепшыя, найбольш падрыхтаваныя рабочыя. Аднак гэта не аблягчае працу прапагандыста. Задача, пастаўленая перад ім, мабільная — выхаванне сталай, сацыяльна актыўнай асобы, і патрабуе пастаяннага пошуку, багатага жыццёвага вопыту. І таму калі ў парткоме аб'яднання вырашалі, каму даручыць весці заняткі, абавязкова ўлічвалі асобу прапагандыста, якая павінна быць аўтарытэтам для слухачоў. І іншых думак не было, калі вучыць моладзь даручылі Г. Н. Насардзінаву, камуністу з саракагадовым партыйным стажам. У яго слова не разыходзіцца са справай. Адказнасць, абавязковасць, высокая патрабавальнасць да сябе — гэтыя рысы характару Гафар Назаравіч стараецца выхоўваць у сваіх слухачоў.

...Ішло наступленне на Ліндэн-Алау. Пад шквальным агнём падраздзяленні палка фарсіравалі Одэр. У гэтым баі асабліва вызначылася рота Насардзінава. Умела манеўруючы на полі бою, атакуючы там, дзе фашысты менш за ўсё чакалі, гвардзейцы прасоўваліся наперад. Рота Насардзінава знішчыла каля сотні фашыстаў, амаль цэлы ўзвод узяла ў палон, захапіла дзесятак кулямётаў, восем рачных параходаў, дванаццаць чыгуначных вагонаў, пяць складоў з ваеннай маёмасцю, некалькі аўтамашын. За мужнасць, гераізм, умелае кіраванне падраздзяленнямі пры фарсіраванні Одэра Г. Н. Насардзінаву было прысвоена званне **Героя Савецкага Саюза.**

Гафара Назаравіча Насардзінава ў аб'яднанні ведае амаль кожны. Яго часта запрашае моладзь у інтэрнаты, і ён заўсёды ахвотна прыходзіць на сустрэчу з ёю. Салдата Вялікай Айчыннай вайны, які прайшоў шлях ад Сталінграда да Прагі, якога тройчы даганяла варожая куля, які на зло лёсу выстаяў і выжыў і сёння застаўся ў страі, хочуць бачыць і чуць юнакі і дзяўчаты на камсамольскіх сходах, урачыстых мерапрыемствах.

Зараз у аб'яднанні праходзіць ударная працоўная вахта ў гонар 40-годдзя Перамогі і 50-годдзя стаханаўскага руху. Лепшаму камсамольска-маладзёжнаму калектыву за найвышэйшыя паказчыкі ў працы будзе ўручаны прыз імя Героя Савецкага Саюза Г. Н. Насардзінава. Калектыў Уздзенскай фабрыкі жаночага абутку вырашыў залічыць ветэрана ганаровым членам свайго калектыву. Гафар Назаравіч з ахвотай прыходзіць на сустрэчы з навучэнцамі базавага вучылішча прадпрыемства. Добра ведаюць Г. Н. Насардзінава і школьнікі падшэфнай школы. Сімвалічна, што гэтага чалавека запрасілі вучні 105-й школы праводзіць урок мужнасці.

Ён мог бы расказаць ім, хто ведае пра вайну з кніг і кінафільмаў, аб ваенных баталіях, якія засталіся ў памяці назаўсёды. Але ён расказаў ім аб іншым. Як сустрэўся са сваім аднапалчанінам... праз сорак гадоў. І ўсе гэтыя гады яны шукалі адзін аднаго. Расставаліся маладымі, сустрэліся — сівымі... Вось які злы жарт сыграла з імі вайна. Якой цаной вымераць плату за разлуку?

Гафар Назаравіч расказвае аб гэтым, з цяжкасцю стрымліваючы хваляванне. Ідучы на сустрэчы са школьнікамі, яго не пакідала думка: а ці зразумеюць дзеці? Ці зразумеюць, што самая галоўная размова ў яго будзе не пра вайну, а пра мір, які берагчы і ўмацоўваць ім, тым, хто сёння сядзіць за школьнай партай. Дарэмна хваляваўся Гафар Назаравіч: затаіўшы дыханне, слухалі яго хлопчыкі і дзяўчынкі, якія ніколі не бачылі вайны. Каб запомніць кожнае слова надоўга, а магчыма і на ўсё жыццё. Палымянае слова ветэрана і прапагандыста.

Т. МАНЕНАК.

ЧАЛАВЕК З ЛЕГЕНДЫ

ЗРАБІЎШЫ круты віраж, самалёт узяў курс на базу. Што ж, папрацавалі нядрэнна. Вунь колькі смяротных факелаў палае ўнізе. Гараць варожыя танкі, бронемашыны. Ахопленыя панікай, бягуць па полі фашысты. «Шкада, скончыліся боепрыпасы, а то б мы вам...»

І раптам разважанні лётчыка абарваліся. Пільнае вока Коўзана заўважыла фашысцкага сцярвятніка. «Ты куды гэта спяшаешся?— падумаў Барыс. — Ці не на Маскву?» Ён развярнуў свой «ЯК» наўздагон нямецкай машыне. І толькі тады, калі ў прыцэле злавіў чорную свастыку, успомніў пра баявы камплект: «Што рабіць? Не схопіш за горла, як у рукапашнай, не стукнеш прыкладам». І тут жа мільганула думка: «Таран!». Ён успомніў камсамольскі сход, геройскі ўчынак Віктара Талаліхіна, які ноччу тараніў варожы самалёт. Не ведаў Барыс, што два дні назад Віктар загінуў у няроўным паветраным баі.

Чырваназорны знішчальнік імкліва набліжаўся да варожага «месершміта». Гітлераве разгубіўся: чаму не страляе, што задумаў савецкі лётчык? Пачаў манеўраваць, стараючыся пазбегнуць праследавання. Ён то кідаўся ў піке, то ўзнімаўся вертыкальна ў неба. Аднак «ястрабок» літаральна «сеў» на хвост праціўніка. Яшчэ імгненне, і Барыс адчуў, як страсянула яго машыну, заўважыў, як клюнуў носам нямецкі самалёт і ў дзікім штопары пайшоў уніз.

Коўзан выраўняў «ЯК» і зноў узяў курс на свой аэрадром. «Меў рацыю Талаліхін,— падумаў Барыс.— Можна біць ворага ўрукапашную і ў паветры».

А лік баявым трафеям 19-гадовы лётчык Барыс Коўзан адкрыў ужо на трэці дзень вайны. Яе вогненны шквал накочваўся з захаду. Барыс патруляваў над Гомелем. І вось на гарызонце ўсплыў чорны сілуэт фашысцкага бамбардзіроўшчыка, які набліжаўся да горада. «Правер здольнасці, асаавіяхімавец!»— загадаў сабе юнак і накіраваў машыну наперарэз няпрошаным гасцям. І вось шлейф чорнага дыму пацягнуўся за фашысцкім «хейнкелем». Колькі радасці прынесла гэтая першая перамога маладому лётчыку!

На франтах Вялікай Айчыннай вайны ён зрабіў 360 баявых вылетаў, збіў 28 варожых самалётаў. Аднак такія лічбы былі б няпоўнымі, калі не назваць яшчэ адну — 4. Цану ёй ведаюць толькі героі паветранага бою. Барыс Іванавіч Коўзан — адзіны ў свеце лётчык, які тараніў чатыры варожыя самалёты.

Неяк у канцы лютага сорак другога года над горадам Таржок сустрэлі яго тры «юнкерсы». Барыс прыняў няроўны бой. Адбіваючыся ад фашыстаў, пайшоў на таран галаўнога самалёта. «Юнкерс» успыхнуў чорным дымам. Аднак «ястрабок» Коўзана атрымаў пашкоджанне. І калі лётчык з цяжкасцю пасадзіў машыну на аэрадром, сябры казалі:

— Шчаслівы ты, Барыс, у кашулі нарадзіўся. Без кулямёта — бац вінтом па хвасце, і фашысту капут.

— А можа і крылом паспрабаваць,— пажартаваў Коўзан.

— Менш будзе клопатаў для рамонтнікаў.

Хутка так і выйшла. Над станцыяй Любніца Коўзан сустрэў у паветры двух нямецкіх «месершмітаў». Прыняў бой і іменна крылом тараніў аднаго з іх.

На вялікім фронце ад Балтыкі ад Чорнага мора ў той дзень адбылося шмат падзей. Тым не менш Саўінфармбюро паведаміла аб гераічным подзвігу лётчыка-камсамольца Барыса Коўзана. Яго імя, як імёны Талаліхіна, Гастэлы, стала сімвалам адвагі, мужнасці і гераізму.

Пад Старой Русай трынаццаць фашысцкіх самалётаў наладзілі сапраўднае паляванне на савецкага сокала. Здавалася, чортаў тузін крыжападобных павукоў умомант праглыне чырваназорную птушку. Гітлераўцы падпалілі коўзанаўскі «ЯК», акружылі палаючы самалёт. Адзін з іх пайшоў на савецкі знішчальнік у лабавую атаку. І тут жа Коўзан знізу тараніў фашысцкага сцярвятніка.

Што было потым, ён не памятае. Чырвонаармейцы, якія наглядалі за паветраным боем, знялі пілоткі: загінуў адважны сокал. Але неўзабаве ў газетах быў апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Коўзану Барысу Іванавічу звання **Героя Савецкага Саюза.** Слова «пасмяротна» не было ў ім. Значыць, жыве.

Кожны бой у небе — вялікае выпрабаванне волі і майстэрства. Нельга забыць пра тыя секунды, калі вырашалася пытанне: хто каго? Да дробязей помняцца эпізоды. Асабліва ўрэзаўся ў памяць першы таран, які здзейсніў 29 кастрычніка 1941 года. Нібы прысвяціў яго дню нараджэння камсамола. А потым яшчэ сотні палётаў, подзвігаў, раненняў, цяжкіх дзён перажыванняў. І зноў палёты.

Жыццё гэтага чалавека нібы легенда. Нават сучасныя асы рэактыўных лайнераў іншы раз сумняваюцца: ці быў такі Коўзан? Можа, яго выдумалі, як у былінах Ілью Мурамца, Мікіту Дабрыніна і іншых народных волатаў?

Не, не выдумалі. Вось ён сядзіць са мною, расказвае пра нядаўнюю сустрэчу з юнакамі-дапрызыўнікамі. Рухавы, энергічны, ён яшчэ знаходзіцца пад уражаннем размовы з будучымі воінамі.

— А ці было боязна перад першым таранам?

— Вайна заўсёды страшная. На тваіх вачах гінуць людзі, вораг урываецца ў твой дом, топча самае дарагое — Радзіму. Хіба можна было баяцца за сябе? А сёння нам пагражаюць атамнай вайной. І мы павінны даць адпор мілітарыстам, якія робяць замах на свабоду і незалежнасць народаў свету.

Аднойчы на сустрэчы з піянерамі хтосьці з хлопчыкаў спытаў:

— А праўда, што ў вас дзве маці? Ці гэта яшчэ адна легенда?

Барыс Іванавіч паглядзеў на хлопчыка і ўздыхнуў:

— У мяне тры маці. Тую, што нарадзіла мяне і выгадавала, завуць Матронай Васільеўнай. Яна жыве ў Бабруйску, дзе прайшлі мае дзіцячыя і юнацкія гады. А вось з другой маці, Аляксандрай Яўсееўнай, я ўпершыню сустрэўся ў самым пачатку вайны.

І ён расказаў такую гісторыю. У паветраным баі над невялічкай рускай вёскай Клопна ў прыфрантавой паласе загарэўся яго самалёт. Выкінуцца з парашутам, значыць, адразу ж трапіць у рукі фашыстаў. І ён пасадзіў палаючую машыну каля самай вёскі. Дабег да першай хаціны і ўпаў на парозе. Пажылая жанчына завяла ў пакой і, не трацячы часу на роспыты, падала пінжак, штаны і чаравікі. Гэта была цывільная вопратка яе сына, які знаходзіўся ў арміі. Потым дачка Аляксандры Яўсееўны Ніна перавяла яго цераз лінію фронту да сваіх.

— Пасля вайны я наведаў тую вёску. Сустрэўся з Аляксандрай Яўсееўнай. Гэта была хвалюючая сустрэча,— успамінае Барыс Іванавіч.— Простая руская жанчына сустрэла мяне як роднага. Расказала пра сваё гора. Яе сын не вярнуўся з вайны.

— Будзь, Бора, маім сынам.

Ён упаў перад ёй на калені, пацалаваў абсівераныя мазолістыя рукі і прашаптаў: «Мама...».

— Ну, а хто ваша трэцяя маці?— пасля доўгай паузы спытаў хлопчык.

— Трэцяя?— перапытаў Барыс Іванавіч. Ён нават прыўзняўся з крэсла, абвёў ясным позіркам школьнікаў і сказаў: — Не трэцяя, а першая, самая блізкая, дарагая і самая любімая, гэта — Радзіма.

В. ПРАЦКАЙЛА.

Няхай жыве 40-я гадавіна Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне!

Няхай вечна жыве ў народнай памяці бяспрыкладны подзвіг савецкіх воінаў, партызан і падпольшчыкаў, працаўнікоў тылу, якія атрымалі сусветна-гістарычную Перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне!

Вечная слава загінуўшым у барацьбе за свабоду і незалежнасць нашай сацыялістычнай Радзімы!

(З Заклікаў ЦК КПСС).

ФІЗКУЛЬТУРА

СПОРТ

ФІЗКУЛЬТУРА

На першынстве Белсавета ДСТ «Буравеснік» па барацьбе самба зборная універсітэта заняла чацвёртае месца. А гэты здымак зроблены з першынства універсітэта, дзе агульнакамандную перамогу атрымалі студэнты юрыдычнага факультэта, спартсмены якога занялі першыя месцы ў шасці вагавых катэгорыях.

Фота А. ВАЛОШЫНА.

ПЛАВАННЕ

ЗАПЛЫЎ У ГОНАР ПЕРАМОГІ

ВЕЧАРАМІ вестыбюль Рэспубліканскага водна-спартыўнага камбіната імя 50-годдзя камсамола Беларусі запаўняўся гаваркімі, вясёлымі людзьмі — студэнтамі БДУ. Блакітныя дарожкі, якія бачылі спаборніцтвы самых высокіх рангаў, на гэты раз гасцінна прынялі ўдзельнікаў першынства універсітэта па плаванню, якое ўваходзіць у праграму універсітэцкай спартакіяды, прысвечанай 40-годдзю Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. На старт выйшлі каля пяцідзесяці студэнтаў — прадстаўнікоў дзесяці факультэтаў.

— Наогул у мяне песімістычны настрой наконт вынікаў, — сказаў трэнер зборнай універсітэта, старшы выкладчык Мікалай Фёдаравіч Кузьмянкоў.— Гэта была апошняя «прыкідка» перад першынствам рэспублікі, якое пройдзе ў канцы красавіка. Таго, што мы прадэманстравалі, недастаткова. Але радуе, калі універсітэцкія спаборніцтвы праходзяць пры вялікай колькасці ўдзельнікаў. Асабліва хацелася б адзначыць выдатную работу суддзяў.

Але не будзем вельмі строга судзіць нашых плыўцоў. Многія з іх паказалі нядрэнныя рэзультаты. Лепшымі сталі наступныя вынікі: 100 метраў вольным стылем — Грыневіч (геафак)— 1.17.7 (дзяўчаты), Даюжэнка (фізфак)— 0.58.4 (юнакі); батэрфляем: сярод дзяўчат — Яўсюк (юрфак)— 1.15.3, сярод юнакоў — Базыленка (факультэт радыёфізікі і электронікі)— 1.07.3; 200 метраў комплексным плаваннем: Яўсюк (юрфак)— 2.54.5 (дзяўчаты), Даюжэнка (фізфак)— 2.28.8 (юнакі); 100 метраў брасам: сярод дзяўчат — Саевіч (мехмат)— 1.35.0, сярод юнакоў — Шваркоў (фізфак)— 1.20.1; 100 метраў на спіне: Нікіціна (ФПМ)— 1.23.8 (дзяўчаты), Апоннік (мехмат)— 1.09.9 (юнакі).

У эстафеце сярод дзяўчат першае месца заняў ФПМ, другое — фізфак і трэцяе — біяфак. Эстафета, якая адбылася на наступны дзень, дала такія вынікі: ФПМ — першае месца, мехмат і юрфак — адпаведна другое і трэцяе (дзяўчаты). У юнакоў: на першым — фізфак, на другім — факультэт радыёфізікі і электронікі і на трэцім — юрфак.

Пераможцам спаборніцтваў стаў фізфак. Значна знізіў свае вынікі гістфак. Лепш маглі б выступіць юрфак і факультэт радыёфізікі і электронікі.

З добрага боку паказалі сябе пераможцы — плыўцы фізічнага факультэта. Як яны хвалявaліся адзін за аднаго, як радаваліся поспеху каманды! Спаборніцтвы сталі для іх не толькі спартыўным экзаменам, але перш за ўсё маральным. Давер, узаемадапамога, уменне жыць інтарэсамі калектыву, разумець сяброў — у гэтым сакрэт іх поспеху. Некалькі слоў хацелася б сказаць аб адным з членаў гэтай каманды — студэнце першага курса Аляксею Даюжэнку, які заняў першае месца ў двух відах. Кандыдат у майстры спорту, Алёша кожны дзень па некалькі гадзін аддае трэніроўкам. Але гэта не перашкаджае яму добра вучыцца і выконваць камсамольскія даручэнні (ён камсорг групы). Верыцца, што Аляксея чакаюць новыя спартыўныя поспехі.

Падводзячы вынікі спаборніцтваў, М. Ф. Кузьмянкоў сказаў:

— Трэба паставіць пытанне аб паляпшэнні якасці падрыхтоўкі плыўцоў, і перш за ўсё аб наяўнасці свайго басейна.

А. МАСЬКОВА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

ВУЧЫСЯ КІРАВАЦЬ САБОЙ

Гэты матэрыял мы прысвячаем аутагеннай трэніроўцы. Аутагенная трэніроўка (АТ) разам з фізкультурай і спортам, рознымі працэдурамі, якія ўмацоўваюць арганізм, павінна стаць метадам прафілактыкі ператамлення студэнтаў і актыўнага аднаўлення іх працаздольнасці.

На працягу некалькіх гадоў на кафедры псіхалогіі БДУ імя У. І. Леніна праводзіўся эксперымент па ўкараненню аутагеннай трэніроўкі ў рэжым працы і адпачынку студэнтаў. Укараненне ажыццяўлялася праз гуртковыя заняткі са студэнтамі розных факультэтаў, а таксама факультатыўныя заняткі на філфаку.

Займаліся аутагеннай трэніроўкай каля 80 студэнтаў. Аб станоўчых выніках нашай работы сведчаць не толькі матэрыялы даследавання, але і дзённікі-справаздачы саміх студэнтаў. Прывядзём некалькі прыкладаў з гэтых дзённікаў.

Студэнтка хімічнага факультэта З. да асваення навыкаў псіхафізіялагічнай самарэгуляцыі з дапамогай аутагеннай трэніроўкі пісала: «Хачу павысіць сваю працаздольнасць, каб лепш вучыцца, умець кіраваць сваім настроем і самаадчуваннем». Пасля заняткаў аутагеннай трэніроўкай гэтая ж студэнтка адзначала: «Павысілася працаздольнасць, адчуваю, што зараз магу запомніць больш матэрыялу, чаргуючы аутагенную трэніроўку і вучобу».

Студэнтка філасофскага аддзялення III. параўноўвала наступным чынам свае адносіны да вучобы да і пасля праходжання аутагеннай трэніроўкі: «Раней на нецікавых (для мяне) лекцыях хіліла да сну. Перад экзаменам, залікам, рашаючай падзеяй пачынала хвалявацца і адчувала сябе прыгнечанай. Зараз жа, пасля аутагеннай трэніроўкі, на ўсякай лекцыі, нават сумнай, я навучылася знаходзіць рацыянальнае зерне, а для гэтага ўважліва слухаць і засвойваць інфармацыю. Перад адказным мерапрыемствам я навучылася трымаць сябе ў руках і не хвалююся, як гэта было раней».

У выніку праведзеных намі даследаванняў было заўважана паляпшэнне ў студэнтаў, якія займаюцца АТ, агульнага самаадчування. Як паказваюць рэзультаты псіхалагічных проб, паказчык прадукцыйнасці працы палепшыўся ў 91,7 працэнта студэнтаў, паказчык дакладнасці выканання работы — у 83,3 працэнта студэнтаў, а ў 67 працэнтаў выпадкаў адзначалася павелічэнне аб'ёму кароткачасовай памяці. Гэтыя паказчыкі сведчаць аб высокай эфектыўнасці АТ як метаду псіхафізіялагічнай самарэгуляцыі і аднаўлення працаздольнасці. У работах многіх вучоных-псіхолагаў даказана станоўчае ўздзеянне аутагеннай трэніроўкі на эфектыўнасць вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ВНУ. У гэтых работах абгрунтавана таксама мэтазгоднасць стварэння ў вышэйшых навучальных установах «пакояў псіхалагічнай разгрузкі», у якіх павінен шырока выкарыстоўвацца аутатрэнінг для прафілактыкі ператамлення студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама аднаўлення іх працаздольнасці. Напрыклад, такі пакой ёсць у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце, у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі. Нядрэнна было б стварыць такі пакой і ў нас.

Усё сказанае дае нам падставы рэкамендаваць аутатрэнінг са старонак газеты «Беларускі універсітэт». У даступнай і кароткай форме методыку АТ на старонках газеты выкладае аспірант кафедры псіхалогіі, урач-псіхатэрапеўт Г. Я. Мазо.

Р. ВАДЭЙКА,
загадчык кафедры псіхалогіі, дацэнт.

НА ПРАЦЯГУ жыцця чалавек увесь час знаходзіцца паміж двума крайнімі полюсамі: працы і адпачынку, напружанасці і расслаблення, узбуджанасці і тармажэння, бодрасці і сну. Гэтыя два станы ўвесь час чаргуюцца. Пасля напружанасці і работы адных сістэм арганізма наступае іх адпачынак, а ў гэты час функцыянуюць другія сістэмы. У гэтым заключаецца так званая «рухомая раўнавага» арганізма, які працуе. Але празмерна моцнае і працяглае напружанне арганізма часта становіцца прычынай хваравітых змен, звязаных з парушэннем яго рухомай раўнавагі.

Папярэдзіць гэта парушэнне дапаможа вам малавядомая, але вельмі эфектыўная форма адпачынку, праходзячага ў выніку самаўнушэння, які здзяйсняецца на фоне расслаблення мышц цела. Для таго, каб авалодаць гэтай формай адпачынку, неабходна заняцца аутагеннай трэніроўкай.

«Аутагенная трэніроўка,— як сказаў савецкі псіхатэрапеўт М. І. Спірыдонаў,— гэта не толькі аптэчка хуткай дапамогі пры бяссонніцы і стамленні, але і сродак, які дазваляе чалавеку валодаць сабой у складаных сітуацыях і зніжаць адмоўныя эмоцыі.

Слова «аутагенная» складаецца з двух слоў: «ауто» — сам і «генас» — нараджаючы, вырабляючы, гэта значыць сам сябе вырабляючы, нараджаючы нанава. Гэта трэніроўка, якая праводзіцца самім чалавекам з мэтай самавыхавання, самаўдасканалення, з мэтай прафілактыкі нервова-эмацыянальнай перанапружанасці і ўзнікнення хвароб. Заняткі аутагеннай трэніроўкай садзейнічаюць нармалізацыі сну, адначасова паляпшаецца якасць адпачынку, агульнае самаадчуванне і настрой, зніжаецца хваляванне перад адказным мерапрыемствам. Таму заняткі аутагеннай трэніроўкай не павінны адкладвацца на «заўтра»; памятайце — «адно сёння лепш за сто заўтра».

З чаго пачаць практычныя заняткі па псіхалагічнаму самакіраванню, аутагеннай трэніроўцы?

Спачатку важна навучыцца супакойвацца, пераадольваць хваляванне, калі гэта неабходна, «адключацца» ад непрыемных думак, «прыходзіць у сябе». Калі чалавек хвалюецца, ён дыхае часта і неглыбока. Але калі ў яго добры настрой, ён дыхае лёгка, свабодна, раўнамерна, не часта і глыбока. Дык вось, канцэнтрацыя ўвагі на дыханні, здольнасць прымусіць сябе дыхаць спакойна і раўнамерна пры хваляванні — гэта ўжо на 50 працэнтаў перастаць хвалявацца. Дыхаць патрэбна носам, глыбей. Абавязковы працяглы і спакойны выдых. Частата дыхання — 14—16 разоў у мінуту.

Так, з сённяшняга дня вы бераце пад кантроль сваё дыханне і асабліва пры хваляванні. А каб эфект быў лепшы, узмацняйце гэты кантроль «дыхальнымі формуламі» — словамі самаўнушэння, якія абавязкова патрэбна ў думках вымаўляць, займаючыся аутагеннай трэніроўкай. Прычым вымаўляць іх патрэбна так: слова «я» вымаўляецца пры ўдыху, слова «спакойны» — пры выдыху, астатнія фразы формулы вымаўляюцца толькі пры ўдыху.

«Дыхальная формула»:

«Я спакойны... Я зусім спакойны...
Маё дыханне роўнае і спакойнае...
Дыханне раў-на-мер-нае...
Мне дыхаецца лёгка і спакойна...
Дыханне стала роўным і спакойным...
Кожны ўдых напаўняе мяне спакоем і адпачынкам...
Я спакойны... Я зусім спакойны...»

Гэта практыкаванне можаце выконваць у любым месцы і ў любым становішчы, як толькі вы адчуеце неабходнасць супакоіцца.

Г. МАЗО,
урач-псіхатэрапеўт.

(Працяг будзе).

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Красная звезда» МВПА імя Я. Коласа.

18 красавіка 1985 г.
Зак. 2427. АТ 13292.

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ